# Метадычныя рэкамендацыі па выкарыстанні ў адукацыйным працэсе падручніка «Літаратурнае чытанне»

## Для IV класа ўстаноў агульнай сярэдняй адукацыі з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання

З новага 2024/2025 навучальнага года чацвёртакласнікі пачнуць займацца па перапрацаваным і дапоўненым падручніку «Літаратурнае чытанне» з беларускай і рускай мовамі навучання і выхавання пад аўтарствам М. В. Жуковіча, настаўніка-метадыста, і В. У. Праскаловіч, доктара педагагічных навук, прафесара Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

Кніга адпавядае зместу новай вучэбнай праграмы, складаецца, як і раней, з дзесяці тэматычных раздзелаў: «Чалавек і прырода», «Чалавек і яго род», «Чалавек і Радзіма», «Чалавек, слова і кніга», «Чалавек і мастацтва», «Быць на зямлі чалавекам», «Чалавек і грамадства», «Чалавек і экалогія» (замест назвы «Чалавек на планеце Зямля»), «Лёс чалавека на вайне», «Чалавек, космас і Сусвет».

Абноўлены падручнік (частка 1) пачынаецца двума артыкуламі: зваротам аўтараў да вучняў «Дарагія сябры!» і «Як працаваць з падручнікам» — метадычныя рэкамендацыі па рабоце з імі апісаны ў ніжэйпрыведзеным уроку 1.

На форзацы 1 упершыню з'явіліся дзве новыя памяткі: «Як падрабязна пераказваць прачытаны тэкст» і «Як выканаць ілюстрацыю да прачытанага літаратурнага твора». Новая рубрыка «Творчае заданне» будзе перыядычна нагадваць удзельнікам адукацыйнага працэсу (вучням і настаўнікам), калі патрэбна звярнуцца да зместу гэтых памятак.

Частка 2 завяршаецца развітальным артыкулам «Дарагія чытачы!», у якім аўтары падручніка не толькі падагульняюць пройдзены за навучальны год шлях, але і гавораць пра перспектыву на летнія канікулы — весці дзённік летняга чытання.

Вопытныя настаўнікі пачатковых класаў пры знаёмстве са зместам абноўленага падручніка «Літаратурнае чытанне. 4 клас» адразу заўважаць, што карэнным чынам зменены і старонкі-навігатары да вывучэння тэматычных раздзелаў. На гэты раз **мэтавызначэнне** прадстаўлена праз падрубрыкі «Будзем знаходзіць», «Будзем вучыцца» і «Варта задумацца», у якія на мове вучняў уведзены асноўныя праграмныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці: «Ведаць», «Умець» і «Выкарыстоўваць набытыя веды і ўменні ў практычнай дзейнасці і паўсядзённым жыцці». Пры пастаноўцы задач за аснову браліся падыходы **метаду актыўнай ацэнкі**, з якім настаўнікі пачатковых класаў могуць больш падрабязна пазнаёміцца на старонках сучасных вучэбна-метадычных дапаможнікаў і СМІ.

Работа па навігатарах і мэтавызначэнні таксама прадстаўлена ў ніжэйпрыведзеных метадычных рэкамендацыях. Галоўнае, каб настаўнік на кожным уроку, асабліва на рэфлексійным этапе, пастаянна цікавіўся, як вучні справіліся з пастаўленай канкрэтнай задачай: што атрымалася? якім чынам удалося гэта рэалізаваць? з чым вучні не справіліся? чаму? як можна палепшыць складаную сітуацыю?

Як і ў III класе, у абноўлены падручнік уведзены невялікія партрэты пісьменнікаў практычна да кожнага праграмнага твора. Рэкамендуем настаўніку падчас урока не засяроджваць увагу на біяграфіях аўтараў. Можна паведаміць вучням пра месца нараджэння пісьменніка, што паўплывала на напісанне канкрэтнага твора. Згодна з вучэбнай праграмай, адводзіцца значны час на знаёмства з біяграфіяй Ніла Гілевіча (у частцы 1) і Янкі Брыля (у частцы 2).

У параўнанні з выданнем 2018 г. вопытныя настаўнікі заўважаць змены і ў змесце тэкстыйнага вывучэння. Так, у частку 1 уведзена літаратурная казка «Буслы» Клаўдзіі Каліны, народная легенда «Палешукі і палевікі», мастацка-публіцыстычнае апавяданне «Любая мая Беларусь!» Янкі Сіпакова, публіцыстычна-пазнавальнае апавяданне «Каштоўныя зіхатлівыя каменьчыкі» Сяргея Зелянко, літаратурная казка «Як з'явіўся апостраф» Алены Масла. Частка 2 застаецца без змяненняў.

Некаторыя **ўмоўныя абазначэнні** будуць знаёмыя з вучэбнага дапаможніка па літаратурным чытанні для III класа (2023). Гэта «Маўленчая размінка», «Слоўнік», «Пытанні і заданні», «Работа ў парах (групах)» і «Пафантазіруйце».

У IV класе вучні і настаўнікі ўпершыню сустрэнуцца і з новымі — «Успомніце», «У свеце прыгожага», «Творчае заданне» і «Цікава ведаць», — ролю якіх трэба раскрыць адразу на першых занятках па літаратурным чытанні. Пасля разгляду значкоў (піктаграм) настаўнік цікавіцца ў дзяцей, з якімі абазначэннямі яны сустракаюцца ўпершыню, і прапануе па малюнках і подпісе да іх здагадацца, аб чым піктаграмы могуць інфармаваць чытача.

Назва рубрыкі «У свеце прыгожага» замяняе вядомую з дапаможнікаў па літаратурным чытанні для II, III класаў «Давайце абмяркуем тэму разам».

Падручнік «Літаратурнае чытанне» для вучняў IV класа вызначаецца падборкай інавацыйных заданняў з мэтай фарміравання чытацкай адукаванасці (пісьменнасці / граматнасці). Заданні распрацаваны з мэтай адаптацыі вучняў да ўдзелу ў маніторынгу па ацэнцы якасці адукацыйных дасягненняў вучняў па лініі Міністэрства адукацыі (НДЯА / рус. НИКО).

Многія заданні пабудаваны ў форме тэстаў, яны даюць магчымасць настаўніку і вучням праверыць набытыя веды і ўменні. Кантрольна-вымяральны матэрыял, што прадстаўлены пасля кожнага тэматычнага раздзела пад назвай «Праверце сябе», разлічаны для правядзення падагульняльных заняткаў. Рэкамендуем настаўніку частку ўрока праводзіць у форме гутаркі, а асобныя заданні вучні могуць выканаць самастойна ў пісьмовай форме, што паспрыяе не толькі накапляльнасці адзнак, але і фарміраванню адказных адносін, сур'ёзнаму стаўленню да вывучэння «Беларускай літаратуры (літаратурнага чытання)» як вучэбнага прадмета.

У ніжэйпрыведзеных метадычных каментарыях структурныя кампаненты «Арганізацыйны момант» і «Фізкультурныя хвілінкі» свядома апушчаны: настаўніку даецца магчымасць самому вызначыцца са зместам дадзеных этапаў. Урокі пазакласнага чытання таксама падаюцца арыенціровачна, настаўнік можа адысці ад рэкамендацый і праявіць сваю творчасць і прафесіяналізм пры іх правядзенні.

Такім чынам, падручнік па літаратурным чытанні для IV класа адрозніваецца ад папярэдняга і накіраваны на ажыццяўленне кампетэнтнаснага падыходу ў адукацыйным працэсе на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі.

РАЗДЗЕЛ. **ЧАЛАВЕК І ПРЫРОДА**

### Урок 1. Народныя загадкі пра з'явы прыроды

**ЗАДАЧЫ:** пазнаёміць са зместам першай часткі падручніка, са зместам і задачамі раздзела «Чалавек і прырода»: на што вучні будуць звяртаць увагу і якія ўменні будуць развіваць; узнавіць набытыя ў II і III класах веды пра мастацкія творы на тэму прыроды; пашыраць уяўленні пра загадку як жанр вуснай народнай творчасці; выхоўваць цікавасць да фальклору і развіваць творчыя здольнасці праз складанне ўласных загадак пра з'явы прыроды.

#### Ход урока

Выразнае чытанне ўводных артыкулаў «Дарагія сябры!» і «Як працаваць з падручнікам» (с. 3, 4) настаўнікам ці добра падрыхтаваным вучнем.

Чытанне другога артыкула будзе пакрокавым, з прыпынкамі для выканання заданняў. Настаўнік прапануе разгледзець вокладку падручніка і адказаць на наступныя пытанні:

- Ці спадабалася вам вокладка падручніка? Чаму?

Настаўнік паведамляе, што вокладку намаляваў вядомы беларускі мастак В. В. Дударэнка.

- Якая пара года адлюстравана на вокладцы? Па якіх прыкметах, дэталях вы здагадаліся, што мастак адлюстраваў залатую восень? *(Па жоўта-залацістым колеры лісцікаў бяроз, кустоў і травы; па адлёце ў вырай чарады птушак.)*
- Куды, на вашу думку, крочыць вожык? *(Відаць, палюе, шукае спажывы.)*

- Хто з’яўляецца аўтарамі вашага падручніка?

Пасля знаёмства з умоўнымі абазначэннямі, што змешчаны на с. 4, настаўнік цікавіцца, з якімі ўмоўнымі абазначэннямі і рубрыкамі навучэнцы ўжо знаёмыя з вучэбнага дапаможніка па літаратурным чытанні для III класа. *(«Слоўнік», «Пытанні і заданні», «Маўленчая размінка», «Работа ў парах (групах)»; «Пафантазіруйце».)*

- З якімі абазначэннямі і рубрыкамі вы сустракаецеся ўпершыню? Здагадайцеся па малюнках і подпісе да іх, аб чым яны будуць вас інфармаваць. *(Рубрыка «Успомніце» прапануе нешта ўспомніць, прыгадаць з раней вывучанага; рубрыка «У свеце прыгожага» — сустрэчу з творамі мастацтва і іх абмеркаванне; «Творчае заданне» раіць вучням самім паспрабаваць пабыць творцамі — пісьменнікамі, фотарэпарцёрамі, экскурсаводамі і інш.)*

Разгляд шмуцтытулаў у частцы 1 — загалоўкаў і малюнкаў, змешчаных на с. 5, 33, 59, 89, 115. Настаўнік паведамляе вучням, што загаловак на старонцы — гэта назва раздзела. Колькі шмуцтытулаў — столькі і раздзелаў у кнізе. Кожны раздзел прысвечаны пэўнай тэме. На якія тэмы змешчаны творы ў частцы 1, падкажа змест. Каб не памыліцца ў вызначэнні тэмы асобнага ўрока, у падручніку ёсць «Слоўнік-памочнік для вызначэння тэм твораў», які размешчаны на 2-м форзацы кнігі (частка 1). Настаўнік засяроджвае ўвагу чацвёртакласнікаў на тэме «Чалавек і прырода». Вучні зачытваюць, пра што можа ісці гаворка ў творах на гэтую тэму.

Аналіз 5-й старонкі да тэматычнага раздзела «Чалавек і прырода»:

1) прагляд застаўкі, пералік намаляваных звяроў і птушак; разважанне, чаму мастак адлюстраваў менавіта гэтых насельнікаў лесу;

2) чытанне і асэнсаванне выказвання Якуба Коласа пра прыроду па пытаннях «Чаму пісьменнік называе прыроду кнігай?», «Што, на думку Якуба Коласа, з’яўляецца для чалавека шчасцем? Ці можна пагадзіцца з гэтай думкай? Чаму?».

1. Настаўнік паведамляе, што ў IV класе, як і ў III класе, вучні будуць рэалізоўваць змешчаныя на старонцы-навігатары задачы, адпрацоўваць асноўныя патрабаванні да вынікаў вучэбнай дзейнасці, рэкамендаваныя вучэбнай праграмай для IV класа. Прапануе даведацца, на што будзе звяртацца ўвага і якім уменням трэба навучыцца пры вывучэнні твораў гэтага раздзела.

2. Вучні самастойна знаёмяцца са зместам падрубрык «Будзем знаходзіць» і «Будзем вучыцца».

3. Заканчваецца работа па старонцы-навігатары невялікімі выказваннямі вучняў па пытаннях, пастаўленых у падрубрыцы «Варта задумацца». Адразу акцэнтуем увагу настаўніка, што першасныя адказы чацвёртакласнікаў могуць быць неглыбокімі, нават памылковымі. Самае галоўнае — мяркуецца, што кожны наступны ўрок будзе пашыраць і ўдасканальваць думкі дзяцей. На абагульняльным уроку па тэматычным раздзеле вучням даецца магчымасць яшчэ раз выказацца па пытаннях падрубрыкі «Варта задумацца».

***Работа з народнымі загадкамі пра з’явы прыроды***

Гутарка па карціне беларускага мастака Юрыя Корнікава «Залатая восень» з апорай на пытанні 1–8 (с. 6, 7 падручніка). Работа праводзіцца згодна з апісанымі заданнямі пунктаў 1 і 2 рубрыкі «У свеце прыгожага». Вучні спачатку самастойна разглядаюць адпаведную рэпрадукцыю, а затым даюць вусныя адказы на прапанаваныя настаўнікам пытанні.

Адказы на пытанні і выкананне заданняў рубрыкі «Успомніце», што змешчана на с. 7. Настаўнік можа правесці невялікую літаратурную віктарыну: чытаюцца ўрыўкі з раней вывучаных твораў, а вучні ўспамінаюць і называюць іх аўтара і назву.

а) У бязмежным небе
Роўненькім шнурочкам
Жураўлі ў вырай
Мкнуцца над лясочкам.
*(Якуб Колас. «Адлёт жураўлёў», II клас.)*

б) З буйны́х ліп і бяроз
Лісты валяцца.
Між павалаў і лоз
Рассыпаюцца.
Шапацяць, шалясцяць
Залацістыя,
Ўвысь галінкі глядзяць
Пусталістыя.
*(Янка Купала. «Лістапад», III клас.)*

в) Звоніць, скача, як дзіцятка,
Гэты жэўжык-ручаёк,
На яго, бы тая матка,
Сонца кідае свой зрок.
*(Якуб Колас. «Песня аб вясне», II клас.)*

Чытанне і адгадванне народных загадак пра з’явы прыроды (с. 7, 8).

Настаўнік можа прачытаць і дадатковыя загадкі:

*Стукае, грукае, а нідзе яго не відаць. (Гром.)*

*Бегла ліска каля лесу блізка — ні сцежкі, ні дарожкі, толькі залатыя рожкі. (Маланка.)*

*І шуміць, і гудзе, на ўвесь свет голас ідзе. (Вецер.)*

*Сівое сукно лезе праз акно. (Мароз.)*

*Ляцяць птушкі без крыл, а садзяцца без ног. (Снег.)*

*Прыйшла бела кабыла, увесь свет пабудзіла. (Раніца.)*

*Прыйшла чорна маці, усіх паклала спаці. (Ноч.)*

*Сястра да брата ў госці едзе, а брат ад яе хаваецца. (Ноч і дзень.)*

*Ходзіць курка-жаўтушка па сене і не шастае. (Сонца.)*

*На паляне сіняй пасецца конь сівы. (Месяц.)*

Знаёмства з табліцай пра структуру народных загадак (с. 8). З ідэнтычнай табліцай вучні ўжо знаёмыя з вучэбнага дапаможніка для III класа. Пры яе аналізе настаўніку варта выкарыстаць пакрокавы прыём і падчас свайго аповеду засяродзіць увагу дзяцей на трох формах складання загадак: з дапамогай *пытання*, *апісання* і *супрацьпастаўлення*, якімі давядзецца карыстацца пры выкананні наступнага задання. Вучні спрабуюць прыдумваць свае загадкі рознымі спосабамі (рубрыка «Творчае заданне»).

***Дамашняе заданне***

Падабраць з разнастайных крыніц 2–4 загадкі пра з'явы прыроды. Канкрэтызацыя заданняў да ўрока пазакласнага чытання на тэму «Слова аб роднай прыродзе».

***Падвядзенне вынікаў урока***

- Якую ролю загадкі выконвалі і выконваюць зараз у жыцці чалавека?

### Урок 2. Якуб Колас. «Усход сонца»; Віктар Гардзей. «Жнівень»

**ЗАДАЧЫ:** удасканальваць навык правільнага вымаўлення гукаў, захоўваць акцэнталагічныя нормы пры чытанні; спрыяць фарміраванню вобразнага ўяўлення вучняў аб прыродных з'явах у паэтычных творах летняй тэматыкі; удасканальваць навык чытання (правільнасць, асэнсаванасць, бегласць і выразнасць); развіваць чытацкія ўменні (называць вобразныя словы і выразы ў творах, адзначыць назіральнасць і талент паэтаў у перадачы ў вершах летніх з'яў, захапленне і іх любоў да лета); выхоўваць цікавасць да чытання пейзажных вершаў на летнюю тэматыку.

**АБСТАЛЯВАННЕ:** партрэты Якуба Коласа і В. Гардзея.

#### Ход урока

***Праверка дамашняга задання*** праводзіцца ў форме віктарыны. Настаўнік дае магчымасць жадаючым вучням прачытаць 3-4 падабраныя або 1-2 уласныя загадкі пра з'явы прыроды.

Маўленчая размінка праводзіцца на матэрыяле верша Міхася Сазончыка «Сонца мыецца» (с. 9).

Вучні самастойна 2-3 разы чытаюць верш.

- Пра якую прыродную з'яву расказвае нам гераіня верша? *(Пра ўсход сонца.)*
- Па якіх прыкметах вы здагадаліся, што апісваецца раніца? *(Сонная зямля бывае пасля ночы; звычайна жаўрукі пачынаюць звінець ранкам; сонца падымаецца быццам з вады.)*
- Якія вобразныя словы і выразы выкарыстаў паэт у вершы? *(Сонная зямля, зазвінелі жаўрукі, жаўрукі разбудзілі сонца, мые сонца твар.)*

Пасля гутаркі настаўнік акцэнтуе ўвагу на выдзеленых ў словах асобных гуках, падкрэслівае, што ў слове ***рэчцы*** спалучэнне ***чц*** чытаецца як падоўжаны ***цц***, і сам дэманструе такое вымаўленне. Закончыць маўленчую размінку можна праслухоўваннем падрыхтаванага правільнага чытання верша асобнымі вучнямі і харавым чытаннем дзецьмі ўсяго класа.

***Работа з вершам Якуба Коласа «Усход сонца»***

1) *Уступнае слова настаўніка:*

- На мінулым уроку, калі ўзгадвалі вывучаныя ў II і III класах мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў на тэму прыроды, некалькі разоў гучала імя Якуба Коласа. *(Дэманструецца партрэт.)* Гэты пісьменнік выказаў сваё захапленне рознымі порамі года і прыроднымі з'явамі. Восень апісваецца ў вершы «Адлёт жураўлёў» і ў апавяданні «Ясныя дні восені», пачатак зімы — у паэтычным творы «Зіма» («Надышлі марозы»). Вясна адлюстравана паэтам у вершы «Песня аб вясне» і апавяданнях «Прылёт птушак», «Ластаўкі», «Вясна». А вось пра адносіны Якуба Коласа да лета пакуль чытаць не даводзілася.

2) Вызначэнне лексічнага значэння слова ***зычлівы*** (рубрыка «Слоўнік»). Настаўнік прапануе вучням растлумачыць сэнс запісанага на дошцы спалучэння ***зычлівы сябар*** і адказаць на пытанне «Ці з'яўляецеся вы самі зычлівымі людзьмі?». Настаўнік рэкамендуе прачытаць змест адпаведнай рубрыкі на с. 9 і скласці з гэтым словам і іншымі (***чырвонец***, ***шаты***) свае сказы.

Выразнае чытанне верша «Усход сонца» настаўнікам. Высвятленне першаснага ўспрымання твора: які настрой стварыў у вас верш Якуба Коласа?

Самастойнае перачытванне твора вучнямі з мэтай адказу на пытанне 1 з падручніка (с. 10). *(У творы пададзены летні ўсход сонца. Яно паказана вельмі актыўным: «Сыпле золата над гаем / І над пералескам», «Сноп праменняў, пышна*

*ўзняты, / Сее бляск-чырвонцы...», «Неба грае пераліўным блескам», «...неба ўсміхнецца людзям і прыродзе». Можна здагадацца, што і людзі знаходзяцца на палях і лугах. Відаць, заняты фізічнай працай, таму ў іх «Смех адказны, / Смех шчаслівы ходзіць па пагорках».)*

Аналітычная гутарка па змесце твора на падставе пытанняў і заданняў 2–7: вуснае маляванне карцін, якія ўявілі вучні ў час чытання; вызначэнне вобразных слоў і выразаў, аўтарскіх і ўласных адносін да вобраза сонца.

У чацвёртакласнікаў звычайна не ўзнікае праблем з апісаннем словамі карцін, якія яны ўявілі падчас чытання верша (пытанне 2). Настаўніку на пачатку навучальнага года можна нагадаць дзецям змест памяткі «Як ствараць малюнак словамі»:

1. Уважліва прачытайце ўвесь твор або адну закончаную частку.
2. Уявіце малюнак у думках.
3. Падбярыце словы, якія дапамогуць стварыць малюнак.
4. Раскажыце пра свой малюнак.

Адказ на пытанне 3. *(Паэт выкарыстаў наступныя вобразныя словы і выразы:* ***неба грае, неба сыпле золата над гаем і над пералескам, дрогне чырвань, неба ўсміхнецца, смех адказны, смех шчаслівы, смех ходзіць па пагорках, нікнуць зоркі, заранiца разнімае крылле, сноп праменняў сее бляск-чырвонцы, неба сцеле шаты****.)*

Пры адказе на пытанне 4 трэба засярodзіць увагу вучняў на тым, што іншы раз ад аднаго слова залежыць агульны настрой, які ствараецца ў чытача пасля чытання. Калі ў спалучэнні ***чырвань дрогне*** замест слова ***дрогне*** падставіць слова ***блісне***, то вобраз сонца набудзе больш рэзкі і нават злы характар.

Чытанне верша ланцужком, адпрацоўка выразнага чытання. Знаходжанне радкоў, якія рыфмуюцца.

Калектыўнае складанне партытуры чытання верша:

1. Спачатку ў тэксце вызначаюцца месцы паўз (звычайна на знаках прыпынку).
2. Ставяцца лагічныя націскі на словы, якія з'яўляюцца пералічэннем прадметаў, дзеянняў, якасцей, словы-параўнанні.

Каб паказаць рух галоўнага героя — сонца, — у вершы лагічныя націскі ў радках у асноўным будуць падаць на дзеясловы (*грае*, *сыпле*; *дрогне*, *пралiецца*, *усміхнецца* і інш.). А колеравая гама ствараецца пры дапамозе вылучэння прыметнікаў (*пераліўным*, *адказны*, *шчаслівы*, *зычлівы*) і назоўнікаў (*золата, чырвань, людзям і прыродзе* і інш.).

3. Вызначэнне тону гучання (ён залежыць ад задачы выразнага чытання: што чытач хоча паведаміць слухачам, якія адносіны выказаць да апісанага).

У вершы «Усход сонца» задачай выразнага чытання стане паказ паступовага нарастання сілы і прыгажосці ўсходу сонца.

Тон чытання — ад спакойнага, сцішанага да больш гучнага і моцнага.

4. Тэмп — ад павольнага да хуткага. *(Таму што сонца набірае сілу, усё хутчэй авалодвае прасторай.)*

Завучванне верша на памяць трэба абавязкова пачаць у класе. За гады навучання на I ступені агульнай сярэдняй адукацыі ў вучняў ужо сфарміраваны свае спосабы запамінання паэтычных твораў. Нагадваем, што калектыўная работа з класам па завучванні звычайна праводзіцца пакрокавым спосабам:

1. Спачатку вучні чытаюць поўнасцю ўвесь верш.
2. Пасля паўтараюць першыя 2 радкі і іх запамінаюць.
3. Чытаюць наступныя 2 радкі.
4. Вучні зноў іх запамінаюць і паўтараюць.
5. Пасля паўтараюць па памяці адразу 4 радкі.
6. Чытаюць і паўтараюць зноў чарговыя 2–4 радкі, спачатку аб'ядноўваючы іх па 2 радкі, а затым — па 4.
7. Паўтараюць увесь верш цалкам.

Разгляд рэпрадукцыі карціны Архіпа Куінджы «Дняпро раніцай» і яе абмеркаванне з дапамогай пытанняў і заданняў у падручніку (рубрыка «У свеце прыгожага», с. 11).

Пры параўнанні (пытанне 3, с. 27) абодвух твораў мастацтва — жывапісу і паэзіі — можна пагадзіцца, што амаль усе строфы верша Якуба Коласа, за выключэннем трэцяй, сугучныя з карцінай Архіпа Куінджы.

Для зацікаўленых вучняў настаўнік можа парэкамендаваць зрабіць ілюстрацыі да вывучанага верша «Усход сонца» (рубрыка «Творчае заданне»).

***Работа з вершам Віктара Гардзея «Жнівень»***

Падрыхтоўка да ўспрымання твора.

1) Калі ў вершы Якуба Коласа «Усход сонца» галоўным героем было сонца, то ў творы паэта Віктара Гардзея «Жнівень» яно зусім адсутнічае як прыродная з'ява. Паспрабуйце здагадацца чаму. Дапамогуць даць адказ ілюстрацыі, змешчаныя ў падручніку (с. 12, 13).

Разгляд ілюстрацый і адказ на пытанні «Якая пара года адлюстравана?», «Па якіх прыкметах гэта можна сцвярджаць?». *(Прыкметы канца*

*лета, а менавіта жніўня, мы назіраем па жоўтых жытнёвых палях і спелых каласках (на с. 13). Пра гэта сведчаць камбайн і машына, што заняты падчас уборкі ўраджаю. Неба выглядае светлым і воблачным, як і летам. Над полем, відаць, у пошуках спажывы пралятае бусел, які яшчэ знаходзіцца на Радзіме. Звычайна буслы пакідаюць Беларусь і ляцяць у вырай у канцы жніўня.)*

2) Мэтавая ўстаноўка перад слуханнем верша: паслухаць твор Віктара Гардзея «Жнівень» і адказаць, якія радкі верша сведчаць пра апісанне летняга жніўня. *(«Жнівень белыя палотны / Рассцілае над зямлёй», «Пазбіраюць людзі дбайна / Лета шчодрыя дары» і інш.)*

Адсутнасць сонца як у вершы, так і на малюнку вучні могуць патлумачыць няўвагаю Віктара Гардзея да гэтага вобраза. Магчыма, у дзень напісання твора сонца не было зусім. І, самае галоўнае, звычайна ў жніўні яно пачынае страчваць сваю сілу, бо заканчваецца лета.

Выразнае чытанне твора настаўнікам. Вызначэнне першаснага ўспрыняцця праз пытанні «Ці спадабаўся вам верш? Чаму?».

Перачытванне твора вучнямі, вызначэнне яго настрою.

Аналітычная работа па пытаннях і заданнях 1–7 метадычнага апарату падручніка (с. 13): вылучэнне значэння вобразных слоў і выразаў, вуснае маляванне карцін прыроды, якія ўявілі вучні падчас чытання; вызначэнне тэмпу чытання, аўтарскіх і ўласных адносін да персанажаў твора.

Высвятленне галоўнай думкі верша. Адказ на заданне 5: ***жнівень*** *рассцілае*, *пратрубілі* ***журавы***, *праплыве* ***клін***, ***гром*** *праехаў*, *загудзелі* ***трактары***, *пахне* ***жытам і раллёю***.

Адпрацоўка выразнага чытання твора ўслых. Расстаноўка паўз і лагічных націскаў, захаванне інтанацыі, паўз, патрэбнага тону і тэмпу чытання, перадача рытму ажыццяўляюцца з апорай на памятку «Як навучыцца выразна чытаць твор»:

1. Уважліва прачытайце твор. Старайцеся ў думках уявіць тое, пра што чытаеце.
2. Вызначце свае адносіны да падзей і персанажаў (калі гэта апавяданне, казка ці легенда).
3. Вызначце, якія думкі, пачуцці трэба данесці слухачам праз чытанне.
4. Выберыце адпаведны тон і тэмп чытання.
5. Чытайце правільна кожнае слова.
6. Захоўвайце паўзы на месцы знакаў прыпынку (, : ; ... — ), паміж абзацамі і часткамі твора.
7. Захоўвайце інтанацыю сказаў (? ! .).
8. Выдзяляйце голасам важныя месцы твора.

Калектыўнае складанне партытуры чытання верша «Жнівень»:

1. Як і ў папярэднім вершы, спачатку па знаках прыпынку вызначаюцца месцы паўз.
2. У вершы Віктара Гардзея «Жнівень» лагічныя націскі будуць падаць на розныя часціны мовы. Так, у першай страфе — на словы-прыметнікі (*багаты*, *умалотны*) і назоўнікі (*жытам* і *раллёй*). Каб паказаць жывы рух, змены ў прыродзе, лагічныя націскі трэба ставіць на спалучэннях: ***пратрубілі*** *журавы*, ***стаіць*** *у пазалоце*, ***парыжэлі*** *паплавы* і г. д.
3. Задача выразнага чытання — паказ слухачу прыгажосці і багацця жнівеньскай прыроды.
4. Тон і тэмп чытання — спакойны.

Перад знаёмствам са зместам рубрыкі «Цікава ведаць» (с. 13) рэкамендуем задаць пытанні «Як называецца свята, на якім ушаноўваюцца лепшыя камбайнеры, трактарысты, шафёры, якія паказалі высокія вынікі і прымалі актыўны ўдзел ва ўборцы ўраджаю?», «Ці даводзілася вам прысутнічаць на святкаванні дажынак? Раскажыце, што цікавага і займальнага вы бачылі падчас святкавання». Далей вучні самастойна знаёмяцца з дадатковай інфармацыяй пра дажынкі з мэтавай устаноўкай «Што новага вы даведаліся з гэтага артыкула?».у Адказам стане зачытванне апошняга сказа гэтай рубрыкі.

***Дамашняе заданне***

Вывучыць на памяць верш «Усход сонца».

***Вынік урока***

• З дапамогай чаго паказалі ў сваіх творах Якуб Колас, Віктар Гардзей і Архіп Куінджы летнія з'явы прыроды? Што можна сказаць пра адносіны аўтараў да адлюстраваных імі падзей?

**М. В. ЖУКОВІЧ,**
аўтар падручніка,
выкладчык беларускай мовы і літаратуры
філіяла «Мінскі дзяржаўны аўтамеханічны каледж
імя акадэміка М. С. Высоцкага» ўстановы адукацыі
«Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі»,
настаўнік-метадыст